*УДК 378.147:004.9:94(476):004:005.336.2-057.875*
***В. А. Міхедзька***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў ВЫВУЧЭННІ АЙЧЫННАЙ ГІСТОРЫІ: ПРАБЛЕМЫ ФАРМІРАВАННЯ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ БУДУЧАГА СПЕЦЫЯЛІСТА

Пашырэнне ў адукацыйным працэсе новых інфармацыйных тэхналогій акрэслівае перад выкладчыкамі айчыннай гісторыі адразу некалькі істотных праблем у арганізацыі вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў і падрыхтоўцы будучага спецыяліста – настаўніка, выкладчыка, музейнага супрацоўніка. Першую відавочна стварае сучасная даступнасць інфармацыі з інтэрнэту. З аднаго боку, прываблівае даступнасць інфармацыйных і камунікацыйных сетак, што далучае да інфармацыйнага забеспячэння тых катэгорый студэнтаў, якія былі пазбаўлены паўнавартаснага доступу да яго, перад усім да бібліятэк, – людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, жыхароў раённых цэнтраў і сельскай мясцовасці. Але і для жыхароў вялікіх гарадоў з адносна развітай бібліятэчнай сістэмай доступ да інтэрнэту дазваляе атрымаць амаль недаступныя з розных прычын у "папяровым" выглядзе матэрыялы – як вучэбныя, гэтак і навуковыя выданні, а таксама крыніцы, неабходныя для навукова-даследчыцкай дзейнасці. У той жа час, хутка павялічваецца колькасць рэсурсаў, якія падаюць скажоную, неверыфікаваную або наўпрост фальсіфікаваную інфармацыю, не гаворачы ўжо пра тэксты (як правіла, няякасныя) рэфератаў, курсавых і дыпломных работ. Пры тым, што пашыраюцца праграмныя магчымасці выяўлення нядобрасумленных запазычанняў, адначасова даступныя і тэхналогіі іх абыходжання. Інструментам нейтралізацыі негатыўных магчымасцяў з’яўляецца пастаноўка заданняў, якая ад пачатку накіраваная, з аднаго боку, на атрыманне інфармацыі з інтэрнэту, але, і галоўнае, патрабуе індывідуалізаванай, асабістай перапрацоўкі атрыманага матэрыялу – правядзенне аналізу, параўнання, вылучэння асноўных кампанентаў і г.д. Зразумела, для вядзення паўнавартаснай навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў у галіне айчыннай гісторыі электронных і інтэрнэт-рэсурсаў зусім не дастаткова. Тут яны адыгрываюць хутчэй дапаможную ролю.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

Але для аптымізацыі вучэбнага працэсу яны маюць значныя магчымасці. Самае даступнае тут – выкарыстанне інтэрнэту як бібліятэкі. Вялікія магчымасці для даследчай дзейнасці ў галіне айчыннай гісторыі дасавецкага часу даюць лічбавыя бібліятэкі Польшчы (напрыклад, “Polona”, “FBC”), еўрапейскі праект “Europeana”, лічбавыя бібліятэкі Расіі. Студэнты і выкладчыкі ўрэшце атрымалі доступ да маладаступнай дагэтуль літаратуры, у тым ліку бібліяграфічных рарытэтаў і замежных выданняў. Не так хутка, але пашыраецца доступ да электронных тэкставых версій навуковай перыёдыкі. Бібліятэкі і архівы, выдавецтвы маюць свае вэб-сайты, на якіх прадстаўлена не толькі даведачная інфармацыя, але і электронныя каталогі і часам – электронныя версіі тэкстаў публікацый і дакументаў. Колькасць тэкставых і медыйных рэсурсаў на сайтах дзяржаўных і грамадскіх устаноў і арганізацый хутка пашыраецца.

Інфармацыйныя тэхналогіі могуць і павінны стаць сродкам развіцця ў студэнцкай аўдыторыі творчай, самастойнай думкі.

Неабходна улічваць таксама і асаблівасці пошукавых тэхналогій. Вынік дзейнасці студэнтаў па пошуку інфармацыйных інтэрнэт-рэсурсаў праз даведачна-пошукавыя машыны (такія, як шырока вядомыя Google альбо Яндекс і інш.) залежаць і ад канкрэтных фармулёвак запыту, і ад магчымасцей самой пошукавай машыны. Яны, між тым, не ідэнтычныя. Пакуль што, у сувязі з моўна-тэрміналагічнай спецыфікай айчыннай гісторыі, больш эфектыўныя вынікі па беларускамоўных запытах дае Google, хаця ў студэнцкай аўдыторыі больш пашыраны Яндекс. Таму трэба арыентаваць студэнтаў на выкарыстанне некалькіх пошукавых сістэм. Відавочна таксама, што неабходна больш актыўна арыентаваць студэнтаў на выкарыстанне магчымасцяў электронных каталогаў бібліятэк і архіваў. Павялічваецца і колькасць змешчанага ў сеціве візуальнага матэрыяла. Акрамя таго, за апошні перыяд істотна павялічылася навуковая дакладнасць і інфармацыйная насычанасць даведачных рэсурсаў, у тым ліку шматмоўнай вольнай інтэрнэт-энцыклапедыі Wikipedia. Тут таксама лепшыя вынікі дае пошук у некалькіх нацыянальных версіях энцыклапедыі (вядома, што беларуская версія вольнай энцыклапедыі рэпрэзентавана дзвюма варыянтамі). Істотнае пашырэнне адукацыйных магчымасцяў дае выкарыстанне паралельнага пошуку звестак у некалькіх нацыянальных версіях вольнай энцыклапедыі

З пашырэннем даступнасці электронных рэсурсаў і рэсурсаў інтэрнэту павялічваецца і адказнасць выкладчыкаў. Даючы парады

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

да выкарыстання электронных рэсурсаў, трэба ўлічваць не толькі навуковы ўзровень апублікаваных матэрыялаў, але і адпаведнасць сайта, на якім  яны змешчаны, маральным і этычным нормам, адсутнасць на ім прапаганды нацыянальнай, расавай, рэлігійнай варожасці і гвалту.

Важным накірункам падрыхтоўкі спецыяліста сучаснага тыпу павінны стаць удзел студэнтаў у самастойнай распрацоўцы разнастайных форм рэпрэзентацыі атрыманых вучэбных і даследчыцкіх вынікаў. Пакуль што найбольш пашыранай формай застаюцца электронныя слайдавыя прэзентацыі. Відавочна, што гэта пакуль што адно з найбольш запатрабаваных уменняў спецыяліста-педагога. Аднак наспявае і неабходнасць засваення іншых форм узаемадзеяння гісторыка-даследчыка і гісторыка-педагога з вучнёўскай і студэнцкай аудыторыяй. Пры гэтым ужо зараз зразумела, што такія вучэбныя сістэмы па гісторыі Беларусі павінны накіроўваць студэнта на самастойны пошук і забяспечваць яго неабходнымі дадатковымі даведачнымі матэрыяламі і інтэрнэт-спасылкамі. Такія сістэмы даюць магчымасць не толькі палепшыць якасць навучання студэнтаў дзённай формы навучання, але і стварыць аснову для рэалізацыі ў перспектыве дыстанцыйнай адукацыі.

Пашырэнне новых інфармацыйных тэхналогій ва ўмовах рэфармавання вышэйшай школы і гістарычнай адукацыі у тым ліку дазваляюць істотна наблізіць стандарты і якасць навучання да сусветнага ўзроўню. У выніку гэта дазволіць стварыць канкурэнтназдольнага спецыяліста ў сферы гуманітарнай навуковай і педагагічнай дзейнасці. Засваенне новых інфармацыйных і тэхналагічных магчымасцей, аднак, злучана з шэрагам цяжкасцяў – недахопам тэхнічных сродкаў навучання або іх  састарэлым ўзроўнем, недахопам адпаведнай падрыхтоўкі саміх выкладчыкаў.

У той жа час пераадоленне гэтых праблемаў адкрые шырокія магчымасці для інтэнсіфікацыі пазнавальнай актыўнасці студэнцкай аўдыторыі і дазволіць падрыхтаваць спецыяліста, неабходнага сучаснай школе і грамадству.

**Літаратура**

1. Ландэ, Д. В. Поиск знаний в Internet.  Профессиональная работа: пер с англ./ Д. В. Ландэ. – М., Издательский дом «Вильямс», 2005. – 272 с.

2. Афанасьева, Л. П. Интернет для историка: мусорная корзина или кладезь мудрости? [Электронны рэсурс] / Л. П. Афанасьева // Новый

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

исторический вестник. – 2003. – № 9. – Рэжым доступу: http://www.nivestnik.ru/ 2003_1/14.shtml. – Дата доступу: 21.02.2022.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ